ЮРАСЬ ШАМЕЦЬКА

# НЕПРАДКАЗАЛЬНАЕ



## Вершы

Мінск, «Кнігазбор», 2019

УДК 821.161.3
ББК 84 (4Беи)
Ш19

# Уступ

**ISBN 978-985-7207-76-3**
© Шамецька Ю., 2019
© Афармленне. ПУП «Кнігазбор», 2019

## Непрадказальнае

Сустракаючы непазбежнае,
я знаходжу сябе ў абставінах,
дзе жыццё маё — рэха вечнага,
лёгка шырыцца плынню памяці,
дзе на ростанях паралельнасці,
на вышынях нязвыкла белага
я шукаю жыцця ўзаемнасці,
не цураюся неба смелага...

А ад нас застанецца лепшае
на шляхах, заўжды супярэчлівых.
У абставінах супрацьлеглага
дабрынёй мы заўсёды вечныя...
Застаёмся святлом у раніцу,
непадробнымі, прывітальнымі,
дзе так любіцца, дзе так марыцца
на вышынях непрадказальнага.

* * *

«Пішы, як іншыя не пішуць, —
казаў знаёмы мне паэт, —
і навучыся слухаць цішу, —
там нараджаецца сусвет».
І хоць вагаўся ў хваляваннях,
жыццё дало мне зразумець,
як у натхненні вершавання
магчыма адшукаць свой верш, —
той, што раздзеліць адзіноту,
растопіць нежаданы сум,
распіша для душы палёты,
працягне вольнасць даўніх дум...
І мне пісаць — шукаць нагоду
спазнаць амаль што без прынук
хмяльнога лета прахалоду
і слоў кранальны, чысты гук...



## Мая прастора

Пэўны час — і гэта было даволі доўга —
для мяне існавалі дзве прасторы:
беларуская і канадыйская.

Беларуская — гэта памяць дзяцінства,
захапленні юнацтва,
горад, у якім нарадзіўся і вырас,
і дзе шмат якіх рэчаў зрабіў упершыню...

Канадыйская — гэта бясконцая і халодная зіма,
свабоднае і лёгкае стаўленне да жыцця
мясцовых жыхароў,
іх пастаянная патрэба ўсміхацца,
і ні пра што, па магчымасці, не турбавацца.

Мая падвоенасць існавала пэўны час
і надакучвала сваёй неакрэсленасцю...

Але ў адзін дзень я аб'яднаў дзве прасторы,
зрабіўшы іх адным сусветам...

Цяпер мая прастора пачынаецца з дзедавых могілак,
якія магчыма мімалётна ўбачыць, калі едзеш
у цягніку Менск — Ворша, недзе паміж станцыямі
Слаўнае і Бобр.
Потым працягваецца ў маім менскім двары...
Я заўсёды прыходжу сюды

проста пасядзець некалькі хвілін на лаўцы
каля свайго пад'езду...
І ніхто мяне тут ужо не ведае...

Потым Еўропа...
Там жывуць мае любімыя гарады:
Вена, Намюр, Парыж...

Яшчэ далей — мой дом у Атаве,
дзе я жыву апошнія некалькі гадоў.
Тут жыве мая сям'я,
тут я знайшоў пачуццё чалавечай годнасці і павагі.
Мая прастора — быццам возера, поўнае чыстай вады,
аб'яднаўшыся з бясконцым небам,
знаходзіць месца для ўсяго, што было і будзе:
памяці,
смеласці,
расчараванням,
смутку,
каханню,
прыгажосці,
магчымасці жыць вольна
і гэтаму вершу,
які я напісаў сёння...

# «У Менску я не заблукаю...»

* * *

У Менску я не заблукаю...
Мне мапы болей не патрэбны...
На Далгабродскай адшукаю
царкву, дзе ахрысцілі з небам...
Адчую лёгкасць захаплення...
Сквер перад Операй нязменны...
Я прыміруся з прыцягненнем,
што зазывае ў горад светлы...

У Менску я не заблукаю...
Мой Менск падкажа прывітальна,
што да сябе яшчэ чакае
мяне на плошчы прывакзальнай...
Пацвердзіць даўнюю ўмову:
адно сабе заўжды належыць
і, абмінаючы пакору,
ігнараваць законы межаў.

* * *

Мой горад, зноў цябе я бачу
ў высокім небе, светлай стоме,
на скрыжаваннях, на асфальце,
ў дварах, з дзяцінства мне знаёмых.

Цябе я чую ў ціхіх спевах,
што праслаўляюць радасць мая,
ў цяністых і глыбокіх скверах,
у рухах стомленых трамваяў.

Ты горды ў стыльных капітэлях
калон мастацкага музея,
ў сутоннях вуліц, доўгіх ценях,
намаляваных акварэллю.

Мой горад, падаруй свабоду
пераканацца ў адчуванні,
што я знайду яшчэ нагоду
для новага з табой спаткання.



* * *

Шуканне бога — безнадзейна ў Менску...
Пранізлівых дажджоў не стала меней...
Пяць доказаў стварыў Фама Аквінскі,
а мне не важна — горад-суцяшэнне...
Ад ліхтароў прыцішаныя цені,
як рыцары засмужаных кварталаў,
святло бароняць з мужнасцю нязменнай,
каб сілы цемры болей не паўсталі.

Святло ў акне — тут існага манада,
не ў кляштарах шукае ратавання,
а ў вуліцах, напоўненых спагадай,
не ведаючых сіл супрацьстаяння.
Таму прыму: карункі вуліц доўгіх,
прысад прывабнасць, і двароў маўчанне,
і дабрыню, што ў нашых думках вольных
ужо чакае новага гучання.

* * *

Зноў у Менску вясна!
Горад дыхае маем...
Ці маўчаць, ці крычаць?
Назіранне рэалій...
Чыста вымыты брук...
Дзеясловы натхнення
я шукаю ў сабе —
не хаваю здзіўлення...
Каляровы праспект...
Горад светлы, сталічны...
Гонар бачыць яго
фарбаў лёс гарманічны...
Гаманлівы прастор
пачуваецца вольным...
Зноў у Менску вясна!
Адчуванне бяздоння!



## Захад восені...

Іней дадасць серабрыстай тугі...
Пераменіць аблічча
затоеных чэзлых ваколіц...
Фары хуткіх аўто
і спагадны настрой nostalgie
зіхатлівым агнём
наваколле жывое напоўніць...
Адчуваю —
мне трэба спяшацца дамоў,
я ж стаю і кармлю
нетаропкіх сівых галубоў...

Нацяжэння між небам
і лёгкай душою няма...
Расцуглянасць
зацятага ветру суцешыць...
Зачыняюцца вокны —
ахоўнікі рэшткаў цяпла,
што сыходзіць
і гораду больш не належыць.
Толькі сёння
мой мірны настрой супадае
з асцярожнасцю
ціхіх самотных ускраін...

Да зімы вецер бачыць
жывы лістапад...
Лісце шчыльным велюрам у парку
кладзецца.

Не пужае, што восень мая —
залаты заняпад,
бо жыццё — вірухны,
нескончальны абсяг,
там з сцюдзёнай парой
давядзецца сустрэцца.
І так добра — яшчэ
застаецца жаданне глядзець
на празрыстую восені медзь...



## Снег у горадзе

Я шукаю заспакаення...
Моўчкі стыне зімы сусвет...
Супакоем, нібы маленнем,
снег бароніць мяне ад бед...
Бель яго падаецца ўдачай,
нечакана прытупіць зрок...
Для сябе ж я раптоўна зазначу:
чысты снег так прыгожа лёг...

Снег... Машыны працуюць спраўна,
чысцяць вуліц прастор зямны,
і здаецца жыццё крыштальным
і пазбаўленым сівізны...
Цішыню белым час фарбуе,
тчэ нібыта аснову тайн,
асалоду надзеі чуе,
не прымае зямны падман.

Колькі раз гэты цуд я бачыў,
хваляваўся за лёс зімы
і знікненне сваё прадбачыў
у вясновасці цішыні...
А вакол снегу існа, ўладна
і сумненняў ужо няма.
Гэта праўда, вядома, праўда:
ачышчэнне жыцця — зіма...

## Ускраіна Поля Дельво*

Тут на ўскраіну горада часта прыходзяць
дажджы...
Знойдзем сум хараства ў Серабранцы,
няссечаных дзічак.
Нам здаецца — даўно мы згубілі сваё
адчуванне мяжы,
а жыццё, быццам кола, зрабілася сталаю
звычкай...
Нам заўжды падабаецца ў неба жывое
глядзець,
вышыню адчуваць, нібы лёгка, нячутна ляцець.

Тут, на ўскраіне горада, позна прыходзіць
вясна...
Наступае няпроста... Бясконцасць аўто
на вялікіх паркоўках
дадае адзіноты... А нам, як на дзіва, з табою
хапае цяпла,
каб пісаць эсэмэскі, нібыта паштоўкі...
Мы адно аднаму дасылаем...
Так любоў беражом — гэта ўсё, што мы маем.

Золкай мройнаю раніцай не застаёмся адны...
Не хаваючы радасць ад новых здзіўленняў,

* Поль Дельво — бельгійскі мастак, прадстаўнік сюррэалізму.



на світанку знаходзім крыштальныя кроплі
расы,
ў іх празрыстасці бачым аснову свайго
прызначэння.

І чамусьці мы верым, што ў кроплях світальнай
расы
назаўжды захаваюцца нашы з табой галасы.

## Чытаючы кнігу Адкрыцця

Памяць мая не губляе юнацтва...
Горад, нібыта вялікі курган...
Ведаю сёння — не трэба спяшацца...
Золак над горадам, волкі туман...

Белая столь — той, з дзяцінства — кватэры...
Крэслы, трумо, тэлевізар і стол...
Гул Магілёўкі... Не маючы меры,
цягне мой лёс невядомасці вол.

Альфа нязменна трымае пачатак,
лёгка знаходзіць вытокі прычын
тых, што трымаюць адвечны парадак...
Вуліц аблічча — сюжэт для карцін.

Целы дамоў напаўняюцца духам...
Сырасць знікае ў застыглых дварах,
і даспадобы імклівыя рухі
птушкам і дрэвам, што знішчылі жах.

Радасць святла запаўняе кварталы,
сны святлафораў знікаюць, як дым...
І адчуваючы годнасць і сталасць,
сонца ўзыходзіць, як Зорка Палын...



## Раніцай

У летнім парку цішыня...
У летнім парку лёгка думкам...
Мне раніца здаецца гулкай...
Дзень пачынае дабрыня...

Усход святла, нібыта мара,
сутонне растварае мірна...
Прысады — мова тонкіх ліній,
заўжды праведзеных яскрава.

У летнім парку цішыня...
У летнім парку чую вецер...
Ён звер драпежны, гоніць вечна
аблокі мудрага жыцця.

О раніца, таемны востраў
жыве жыццём і не знікае...
А вогнішча святла распаліць
зноў узыходзячае сонца...

## Швэдар

Імперыя маёй кватэры:
блакітны цесны калідор,
у залі новыя шпалеры,
а за акном — вялікі двор.

Стаяць упэўненыя крэслы,
з люстэркам годнае трумо,
два ложкі ўсё займаюць месца...
Блок батарэйны пад акном.

Даўно пабеленыя рамы,
падлога, а на ёй дыван...
На крэсле швэдар вяжа мама.
Яго насіў, як талісман...



* * *

Мае вытокі — менскія Шары,
Карчы,
        ТЭЦ-3,
                сляпянскія балоты,
стук даміно у сонечным двары,
адсутнасць храмаў з боскай пазалотай,
«хрушчоўкі» — пікасовыя кубы,
каштаны, што ў квітненні адпачылі...
Пакутнікі самоты — галубы
злятаюцца у пошуках месіі.
Квартальныя квадраты глыбіні
непустатой жыццёваю падкажуць,
як зберагчы ў адсутнасці цаны
гуллівы сэнс расчуленых пейзажаў.
Мне б на Шары вярнуцца хоць на міг —
дзе я б ішоў па вуліцах так лёгка,
стос дачытаць недачытаных кніг,
паслухаць шум бясконцай Магілёўкі...
Там я жыву, гляджу, нібы кіно,
жыццё сваё, якое мне дазволіць
зноў адпусціць шары
        і праз акно
                глядзець: ляцяць
                        над горадам спакою.

### Вечаровае

Я прашу плыню вуліц
        на хвіліну спыніцца...
Ў ціхай музыцы вальсу
        чую голас сталіцы
і мінулага памяць
        клапатліва гартаю,
разумеючы мову
        нетаропкіх трамваяў.

Вечаровае неба...
        Ад машын бліскавіцы,
цёмным вокнам будынкаў
        рэха горада сніцца...
Залацістае сонца
        лёгка сходзіць па краі
і ў машынным патоку
        незваротна згарае.



* * *

Я дзякую Богу за міласць
вяртацца вясною дамоў,
адчуць прыцягальную сілу
з дзяцінства знаёмых двароў.

За вечнасць сталічнай шчадроты,
за бойкі, напружаны лёс,
за радасць на плошчы Свабоды
спазнаць суцяшальнасць нябёс...

Я дзякую Богу за міласць
пачуць мамін голас жывы,
за вуліц спагаду і шчырасць,
адсутнасць атрутнай тугі...

За шчасце ўсвядоміць палёгку
штораз міласэрна і там,
дзе можна даверыцца зноўку
заўжды верна-чулым сябрам.

І дзякаваць Богу за міласць,
што нават з далёкіх краёў
ён даў мне жаданне і сілы
вяртацца вясною дамоў...

## Падарожжа

Гляджу, як сцелецца туман,
як паўстае святое ранне.
Твая любоў, як талісман,
дае надзею на змаганне...
О музыка, ты не астынь
і не зрабі жыццё варожым...
Не застануся я адзін
падчас зямнога падарожжа.

Скуласты твар — вось мой партрэт.
Сапраўднасць не праходзіць міма...
Хай беражэ мяне ад бед
надзейнасць і дакладнасць ліній.
А хараство — святла сцяна...
Так лёгка праз яе праходжу —
і існавання больш няма,
а ёсць няспыннасць падарожжа...

# Куды б я ні ехаў, заўсёды прыеду дадому, або Перэгрынацыя ў сучаснасці

Мяркую, што дайшоў да цябе ліст, які выслаў я па ад'ездзе маім з Горадна ад Караля Я. М., які мне досыць значную ласку сваю каралеўскую выказаў з пэўным жаляваннем, што я ў такія далёкія краіны выправіўся.

*З «Перэгрынацыі Мікалая Крыштафа Радзівіла»*

## Успамін пра Радзіму

Халоднай раніцай, вясноваю парою
пабачыў я Радзіму...

Аўто ляцела па шашы імкліва,
і радыё спявала гаманліва.
Туман лажыўся скразны ўздоўж ракі,
пасля зімы залітыя лугі
чакалі сонца.
Мы хутка ехалі, а на краі дарогі
алень стаяў...
Адлегласць — пару метраў.
Машына вельмі хутка праляцела...
Жыццё спявала, дыхала надзеяй...
Так слаўна пачынаўся новы дзень...

Праз дваццаць год успомніўся алень...

## Правідэнсьялес

1

На беразе акіяна
мы будзем слухаць адно аднаго.
Мы станем пра лепшае марыць
і будзем, нібы ў кіно,
глядзець, як змяняюцца кадры
з жыцця незлічоных хваляў,
і верыць, што прыцяжэнне
стварае гарызанталі,
што бачым далёка-далёка,
пакуль нам хапае зроку.

На беразе акіяна
парушым нябачныя сцены,
жывым і магутным хвалям
запомняцца нашы целы...
Мінаем жыцця пакуты,
шануем ласкавасць ценяў,
хоць справа была ў лютым,
цяпла тут не стала меней.
Складаем з упэўненых думак
устойлівы фотамалюнак...

На беразе акіяна
мы будзем сядзець і слухаць,
як лёгкі настрой прымае
прыветлівы голас гукаў...

А хвалі так мякка яднаюць
прадонне з вялікім небам,
дзе наш карабель блукае,
шукаючы цвёрдасць глебы...
Змяняем нязручныя межы
на брыз бесклапотны і свежы.

2

Правідэнсьялес...
Расчахлі свой кайт...
Патрэбны вецер,
сіла і цярпенне,
вышыні неба,
а яшчэ натхненне,
каб распачаць
на хвалях маскарад.

Забыцца пра сябе,
мінуць адчай
і з лёгкасцю
падставіць вочы сонцу,
спакойна дыхаць,
адчуваць бясконцасць,
таго, што называем
словам «рай».

Адам і Ева
назаўжды сышлі,
мы ж засталіся,
каб адчуць дакладна
яднанне з небам...

Гэта так выдатна —
перажываць
прывабнасць вышыні.

Вось адчуваем
хваляў хараство,
захоплена шукаем
звабны вецер,
што без прымусу
лётае па свеце
і кліча нас туды,
дзе ёсць жыццё.



## Колеры

1

Бірузовы — дамінантны колер твайго акіяна...

2

Бачу бурштынны, калі заплючшваю вочы
і падстаўляю твар у напрамку заходзячага
сонца...
Жоўты — асіметрычны, —
натхняе моцна,
а аксамітна-чорны —
фарба тутэйшай ночы...

Лазуркавы паўсюдна...
Ён — як твая пяшчота...
А твой загар глядзіцца стыльна,
нібы пазалота...
Фарбы каралаў — як мноства схаваных міфаў,
а я знаходжу белы
ў кавалку марскога рыфа...

3

Асфальтавая афарбоўка тутэйшых скалаў
нагадвае аб радзіме...
Аквамарынавы далягляд
захапляе настолькі,
што пясок пад нагамі,
нібы ў дзяцінстве,
зусім не колкі.

4

Бачу пунсовы лісцік шыфлеры на пяску...
Падымаю яго...
Ён нагадвае мне твае вусны:
палкія жаданнем і напоўненыя марай
быць абцалаванымі срэбрам хваляў
і маім акіянам...



## Венецыя

Часта не ведае,
 дзе знайсці словы.
Быццам бы ёсць,
 а патрэбных няма.
Ён у шуканні
 дарогі дадому...
Горад Венецыя...
 Горад святла...

Доўга блукае
 ў мностве каналаў,
бачыць лагуны
 празрыстае шкло...
Мост на Рыяльта свой горб
 не губляе...
Вось вапарэтта
 пайшло «на “Лідо"»...

Лёгка праходзіць праз
 ростані часу,
Бачыць фантазіі
 годны выток...
Санта Марыя
 натхнёна і ўласна
дорыць натхнення
 нябачны глыток.

Людзі на вуліцах,
 быццам на глянцы,

час карнавальны
　　і радасны смех,
музыка, спевы,
　　таемныя танцы,
горад гатовы
　　да пуску камет.



## У залі Бацічэлі галерэі Уфіцы

У памяці тых дзён ужо не бачна...
Глядзелі на карціны Бацічэлі,
натхняліся напеўнасцю паважнай,
у хуткім вальсе да «Вясны» ляцелі...
Палац музейны вабны, як надзея...
А ў прыцемках шматлюднай доўгай залі
сябе мы на карцінах пазнавалі
ды ў хвалях прыгажосці маладзелі...

Вось неба пацямнела... І раптоўна
за вокнамі мы ўбачылі зарніцу —
не прыпынілі ж важкую размову
з мастацтвам, што жадала паўтарыць нам:
«Гармонію шукаць заўсёды варта...»
А за акном прыціхлыя сініцы
нас бачылі...
І трэскаліся фарбы
ад хваляў фларынтыйскай навальніцы...

## Вакзал

Вакзал на плошчы мне знаёмай
сваёй стракатасцю здзіўляе,
кароткай стрыманай размовай:
— Што? Ад'язджаеш? — Ад'язджаю...

Шляхоў сваіх не выбіраю...
Я ведаю — мне сёння ехаць...
Аб'ява дыктара знікае
і чуецца працяглым рэхам...

Перон памыты, як на свята...
З таксовак музыка іграе...
На вуліцы пачатак лета
цяплом прыемным абдымае...

Не выбіраю — еду далей...
Больш не патрэбны перамогі,
а сэрца б'ецца ў хваляванні —
зноў пачынаецца дарога...



## Начны ад'езд

Будзільнік уначы,
          шурпатыя прыступкі,
мой позірк доўгі ўніз,
          там шолахі у смутку,
жалезны стогн дзвярэй
          бяссоннага пад'езду,
і часу больш няма
          да хуткага ад'езду...
Чароўны бляск зямлі
          пад месяцам нязменным,
утульнасць у двары
          пад чорным небам дрэмле...
Дакладнае таксі
          вязе мяне ў напрамку
таго, што не змяніць,
          дзе не магчымы праўкі...
Свой лёс не прыпыніць...
          Па радыё няспынным
жыццё спявае блюз,
          імчыць праспект пустынны...
Мне ж хочацца спытаць:
          «Чаму бывае часта,
нам трэбна ад'язджаць,
          каб назаўжды застацца?»
Вось хутка мой палёт,
          а мне падумаць цяжка
пра мой начны ад'езд...
          І ў чым жыцця развязка?

## Еўропа

Сядаю ў цягнік...
Жыцця адкрываю сакрэты...
На першай гадзіне
кандуктар праверыць білеты...
Адчую дакладна,
як хуткасць цягнік набірае,
а потым здымае
трывогу чаканага раю...
«Куды сёння еду?» —
сябе запытаю раптоўна...
Не трэба змагацца
з наборам няспынных законаў...
Хоць звычка парою,
нібы аксіёма:
куды б я ні ехаў,
заўсёды прыеду дадому...
Не трэба спяшацца,
бо прыйдзе цягнік па раскладзе...
Утульнасць і хуткасць,
у кожным вагоне парадак,
Пейзаж навакольны —
заўжды нечаканы:
гляджу з асалодай,
я ў чыстым паветры знікаю...



## Герані

Рахманы вечар... Горад Бруге...
Пабачыў на акне герані...
Мне кветкі выглядам кранальным
аб Беларусі нагадалі.

Такія бачыў я ў мамы...
Старанна палівала ўранку
і клапацілася гадамі,
заўжды прыгожымі трымала...

Вось і цяпер мяне здзівілі...
Такія самыя... З дзяцінства...
Ружовых кветак павуцінне
і ўзор, як быццам на карціне...

Стаяў і разглядаў герані...
Зноў думаў пра сваё вяртанне...
Шаптаў, каб перадалі маме
праз далеч словы прывітання...

* * *

Убачыш Паўночнае мора,
паверыш, што ты не першы,
хто з морам пачаў размову,
каб рыфмы знайсці для вершаў.

Ты будзеш ісці да мора,
што рухае хвалі ўпарта,
парыў неспакою пройдзе, —
жыццё не дае фальстарту.

Сляды на пяску пакінеш,
забудзеш пра лёс фатальны
і мора на фота здымеш
так проста і так звычайна...

Аблашчыць гуллівы вецер,
што рухае сціжму хваляў.
Ты ж словы любві прашэпчаш,
каб вечнасцю вольнай сталі.



## Тафіна*

1

Тафіна — сапраўдны край свету...
Выспа Ванкувер...
Холад дзіўнага лета...
Ўзбярэжжа Ціхага акіяна...
Поўныя рэстараны бліжэй да ночы...
А колеры захаду,
быццам напамін аб пажары...

2

На беразе акіяна цягне паслухаць чаек...
Мы ходзім па пяску, нібыта па скуры
не вядомага нам цела...
Сустракаем барадатых рыбакоў,
падобных на горцаў...
Туманная раніца, жоўтае сонца...

3

Думаецца, што калі-небудзь акіян можа
пазмагацца з небам
за магчымасць праверыць, хто з іх большы...
І гэта стане сапраўдным іспытам,
але ніхто не называе неба ціхім,
а акіян — міфам...

---

* Тафіна — гэта раён з насельніцтвам у 1876 жыхароў на заходнім узбярэжжы вострава Ванкувер у канадскай правінцыі Брытанская Калумбія.

Тафіна — цвік для нацягнутай ніткі,
другі канец ніткі — Дальні Усход.

4

Хадзіць па вадзе немагчыма.
Гэта не ад адсутнасці веры.
Холадна, золка...
Бясконцыя пляжы Тафіна
здаюцца нам Марсам, а можа, Венерай,
Сітхінскія ёлкі... Палын...
А мы чакаем адліў...

5

Адліў...
Прасохлы на некалькі гадзін пясок
рассцілаецца ля нашых ног,
а чаканне ночы з пасеянымі
на небе зоркамі абвастрае зрок.
Пастаянства суцяшае, і нам здаецца,
што пазней яшчэ напішуцца вершы...
А цяпер проста карціць пабегчы...
Да акіяна бліжэй... Да акіяна...

6

Я тэлефаную маме.
— Сын мой, а дзе ж ён, край гэтага свету?
Мама кажа, што мые посуд,
скардзіцца на холад
свайго беларускага лета,

Маё беларускае лета...



* * *

Шматкроп'е нязменных прыцішаных гор.
Дарога ніколі не шэпча: «Амін».
Мы крочым па беразе, быццам дазор,
Здаецца, з эпохі
дынастыі Мін.

Шануем нястомны няўрымслівы час,
што вабіць заўсёды да срэбных вяршынь,
хоць шлях зямны патрабуе ад нас
трымацца цяпла
ўрадлівых далін.

Пейзаж дрымотны, як спісаны з кніг,
дадасць ахвоты благое забыць,
а птушкі знаёмы адрывісты крык
упарта зноў
да жыцця натхніць.

## Шпацыр па беразе Ціхага акіяна

1

Я цябе душой заўжды пачую...
Толькі ўсё ж яшчэ патрэбен зрок
бачыць акіянскую глазуру,
што стварае вечнасці выток.
Для бязмежжа хвалі, як стагоддзі,
не заўважаць калыханне змен:
ведаюць, што знойдуць бераг родны,
і таму выводзяць гучна спеў.
У Гамера акіян — пачатак,
мноства хваляў не пералічыць,
лёгкім зыбам робіцца парадак,
акіян ніколі не маўчыць...
Ён настрой гарэзліва мяняе,
ведае адвечнага парог
і сваю любоў мне давярае,
каб яе душой пабачыць змог...

2

Таемнасць працяглай ночы,
вяртанне не будзе скорым...
Па доўгім беразе крочым,
нібы па прамым калідоры.
Нам неба стварае іспыты,
сцвярджаюць упэўнена зоркі,
што далей не будзе нябыту
падчас нашай доўгай вандроўкі...
Зрабіцца нічым вельмі лёгка...
А хронікі з мноствам дэталяў
не стануць прыемнай палёгкай
у нашым зямным існаванні.
Зноў вабіць майстэрства жаданнем
глядзець, як міргаюць зарніцы,
як ноч нам так проста вяртае
святло залатой Мілавіцы...

3

Якая розніца, дзе стаць самім сабой?
Знайсці ў сабе хвіліну памаўчаць,
заўжды жадаць зноў паляцець дамоў
і гэтага чакання не губляць.
Ісці па беразе...
Не заўважаць, як час
стварае рытмы і дае магчымасць
патрэбнае, як словы, адшукаць
і абмяняць упэўненасць на міласць.

Якая розніца, дзе быць самім сабой?
Зацішаны шукаць, вышэй узняцца,
дзе сэнс адзін — каханне, і спакой,
і доўгі шлях, што не дае не спыняцца.
Ісці па беразе...
Адчуць — на нас глядзіць
магутны свет, упэўнены і зорны,
паверыць раптам —
болей не згубіць
настрой душы, аблашчаны любоўю.

## Меланхалічны захад у Ванкуверы

1

Меланхолія страчаных слоў...
Хваляванні ласкавай прыроды...
Мы мяняем метал на любоў
без ужо відавочнай выгоды.

Летняй лавы асфальтавы ток,
акіянскі, нястрыманы вецер...
Скрыжаванне бясконцых дарог...
Чым мяне гэты горад суцешыць?

Лета гоніць засушлівы хмель,
крочаць жвава няроўныя цені...
Святлафоры, машыны, гатэль,
парк названы заслужана – Стэнлі.

Бачу позірк празрыстых прысад,
ніткі доўгіх аголеных вуліц.
Вось на даху прыцішаны сад,
хмарачосаў спакой і панурасць.

Так звычайна канчаецца дзень,
быццам ведае — ён не фінальны...
Вуліц шум, іх задумлівы спеў
ноч да раніцы мірна спыняе.

2

Ракета вечара ляціць у горад вольны...
А час зямны, нястрыманы і марны,
элегіяй сваёй жыццё напоўніць
і зробіць, як парыў, непрадказальным,
ці станецца недасягальнай мэтай,
з жаданнем захаваць ласкавасць лета.

У горадзе святло сваё шукаю...
Вітрыны каляровыя праспектаў...
Жанчын яскравых хвалі адчуваю,
асфальт гарачы — непазбежнасць лета.
Адчайна адхіляю халады —
няма больш болю і няма журбы.

Засмяглы вецер стогне, не маўчыць...
Аўто, як думкі, пралятаюць хутка...
Душа мая за чарадой сініц
спяшаецца упэўнена, без смутку...
Сінеча-ноч па горадзе плыве,
я ведаю — мой лёс належыць мне...

## Хмарачос

Няпроста, пакутліва, быццам грахі,
аддаў адзіноце душу хмарачос...
Жыццё яго — плыня няспыннай ракі,
прымае наўпрост свой настойлівы лёс...
У жыцці хмарачоса ёсць мэта адна —
цярпець безаглядна людскія капрызы...
Ён больш, чым складаны набор ДНК,
яму не патрэбны крэдыткі ці візы...
Ён слухае птушак, глядзіць на асфальт,
жыве так звычайна: стаіць ля дарогі...
Высокі і мудры... Ён, быццам Сакрат,
ніколі не лічыць свае перамогі...



## Беларуская Атлантыка ў бухце Пегі

1

Вакаліз акіяна,
незлічоныя гукі...
Я элегію чую
у бясконцасці рухаў...
Хваль вялікіх, халодных
адчуваю свабоду
ў асалодным спатканні
з суцяшальнай прыродай.

Холад ветру стальнога
чыстым спевам натхняе...
Акіян вольным духам
час зямны прыпыняе...
Птушцы ў гучным палёце
ён даруе падтрымку,
замірае навечна
на маім фотаздымку.

Тут па беразе доўгім
крочу далей і далей,
хваляў плёскат працяглы
мой настрой уздымае...
Гукаў гнуткіх ласкавасць —
непаўторная мова...
Для сябе пазычаю
мне патрэбныя словы...

2

Свет бачыцца недасканалым,
шурпатым, часта ганарлівым...
Магутны подых акіяна
і хвалі мудрасці глыбіннай
нас да сябе заўсёды клічуць,
каб нешта новае пазычыць.

А мы гатовыя шукаць
сябе на беразе пустынным
і на пяску, заўжды маўклівым,
пра закаханасць напісаць,
пра смутак гордай адзіноты,
пра рэзананс нячутных нотаў.

Няроўна-спеўны гук вады
мы ўжо з табой не заўважаем,
ў адной прасторы — я і ты,
і акіян — любоў зямная...
Святло спагаднага бязмежжа,
дзе мы адны на ўзбярэжжы...



## Алма

1

Мы прыехалі на атлантычнае ўзбярэжжа,
і першае мястэчка, у якім апынуліся,
называлася Алма.
Чамусьці ўспомнілася беларускае мястэчка
Волма.

2

Першы дотык акіяна — Алма...
Там на супрацьлеглым беразе — Еўропа.
Саланаваты пах марской вады...
На прыстані маленькія,
падобныя на лялечныя, караблікі
выглядаюць непрытульнымі...
Сезон лоўлі амараў з лістапада па сакавік.
Стаяла прахалоднае канадыйскае лета.
Алма – гэта блакітна-перламутравае неба,
невялікае, бледна-аранжавае сонца,
шаравата-свінцовая пласціна
акіянскай ледзяной вады.

3

Мы думалі ўбачыць чаек,
але іх не было...
Поўнач і суровая зіма
не даюць затрымацца птушкам
нават на непрацяглы летні час.

Алма — адчуванне адсутнасці вялікай
цывілізацыі.
Тут няма раскошы ці празмернасці,
а жыхары падаліся нават сціплымі...

4

На беразе ў невялічкай краме
мы набылі амара.
Хлопец працягвае нам яго,
папярэдне завярнуўшы
ў мясцовую газету.
«Палівайце амара алеем,
калі будзеце есці», — кажа ён
і дадае маленькія пакецікі з алеем...

5

Алма — гэта магчымасць
пабачыць і адчуць сапраўднасць акіяна,
яго настрой, яго фарбы...
А яшчэ — гэта магчымасць захаваць у памяці
задавальненне ад дотыку да твайго цела
і здзіўленне, пабачанае ў тваіх вачах,
колер якіх так супадае з колерам акіяна.

6

О, як выдатна,
што цяпер акіян будзе ведаць і нас.



## Слухаючы Філіпа Гласа

Халоднае лета... Кейп-Брэтан...
Пранізлівы подых святла...
Мы слухаем музыку Гласа —
аскепкі празрыстага шкла.

Як песню нястомных атлантаў,
мы чуем таемны прастор,
збіраем, нібы фаліянты,
святочны і ўзнёслы настрой.

Мы — музыкі дзейная частка...
Нам мроіцца шчасце спазнаць.
А тут вельмі лёгка застацца
і музыку з небам з'яднаць.

Упэўнена, моцна, старанна
мы з музыкі лепім святло,
і цягне да думкі дакладнай:
пачатак жыцця — хараство.

Як добра з мастацтвам спаткацца,
хоць шлях яго — тонкая ніць,
нам музыкай Гласа застацца,
нам доўгае лета пражыць.

## Снежань

1

Снежань... Мы ж успомнім пра ўзбярэжжа,
дзе мы летам знайшлі прытулак
нашай любасці непазбежнай,
зберагліся ад хмарных думак.

Час зямны свой адлік не спыніць,
лёс пакіне святло нязменным...
Бесклапотна сумненні здыме
воднай гладзі заспакаенне...

Быццам простая лінія — бераг,
нашы душы ў чаканні раю,
ад яго нам ужо не збегчы —
наша памяць святло трымае...

2

Мы — пачатак бясхмарнага новага дня,
што калісьці настане — а нас ужо, можа,
не будзе.
Не хвалюйся, бліжэй падыходзь да акна,
там убачыш дарогу і сонца над горадам
людным.
Тонкай лініяй цягнецца мэта жыцця,
прыйдуць іншыя дні і маўклівая доўгая просінь.
Разам будзем шукаць неабсяжнасць святла
ці прастору, якая яшчэ да сябе неаднойчы
запросіць.



Разам будзем гартаць свой зямны каляндар,
планаваць падарожжы, народзіны, справы,
адчуваць кожны дзень, быццам свята ці дар,
і не будзе для нас ні маркоты, ні славы...
Потым будзем чакаць надыход цемнаты,
бачыць — снег распыляе напорыстасць
межаў...
Там мы знойдзем шляхі, пабудуем масты
і пяройдзем па іх у ласкавы і літасны снежань.

## Перамога

Час ідзе... І калі б мяне запыталі,
куды б я жадаў паехаць,
я б не раздумваючы паехаў да акіяна
на востраў Кейп-Брэтан:
халодны, суцяшальны,
гарысты і таямнічы,
магутны, непераможны.

Я б доўга сядзеў на беразе
і думаў: «Чаму так цягне да сябе вада?»
Можа, ад таго, што я рыба па гараскопу...
Глядзеў бы на праліў Касо
ў напрамку выспы Прынца Эдуарда...

Я сеў бы на край скалістага абрыву і звесіў
ногі,
як гэта зрабіў паэт Ігар Канановіч,
які прысеў на край даха,
распаволіўся і нечакана
нават для самога сябе — паляцеў....
Гэта была яго перамога...

А я ведаю, што не паляцеў бы...
Бо мая стыхія — гэта вада...
Вада для мяне — пранікненне ў вечнаць,
бурліць і спяшаецца,
заўсёды абыходзячы складанасці і парогі...

Там на выспе Кейп-Брэтан
я быў бы не адзін,



бо мая Беларусь была б са мной...
Я ж ужо прывозіў яе летась,
і таму акіян будзе яе ведаць...
Тут мы ўсе будзем разам,
дый, можа, бліжэй да бога...
І гэта будзе мая перамога...

* * *

Нечакана захочацца з'ехаць
на Кэйп-Брэтан, бо ёсць жаданне...
Акіян – суцяшальная Мекка,
дасць пабачыць момант яднання
вадзяной і нябеснай сферы
і ў выгнанне сваё не верыць.

Нечакана захочацца ехаць
у Еўропу, нібы на свята...
Там жыве ў музеях Брэйгель,
што надаў забыццю стракатасць...
У кавярні маўкліва паснедаць,
потым Бэнксі выставу наведаць.

Нечакана захочацца з мамай
пасядзець за гарбатай на кухні.
І не думаць — зімой упарта
мы губляем цяпло і гукі...
Толькі ж мама цяпер маўкліва
зноў чакае прыезду сына...

Але ж добра, што хочацца ехаць,
бо дарога — заўжды натхняе...
Вось з удзячнасцю чую рэха —
гэта мой самалёт узлятае ...
Быццам вальс за акном гучыць...
А жыццё?
Ах, як шпарка ляціць!

# Мой Менск — Атава...

## Адлюстраванне

Мой Менск — Атава... Хутка час ідзе...
Ужо не засталося адзіноты...
Маёй душы, як колам на вадзе,
патрэбен камень, — я ж шукаю ноты...
О, колькі нас, раскіданых паўсюдна,
блукае марна ў вечнасці пакутнай...

Вось, шмат гадоў прайшло... А я ўсё той жа:
па зорках чыстых сталасць вывучаю,
паверыў я — жыццё мне дапаможа
пазбегнуць адзіноты і адчаю,
каб мець яшчэ магчымасць спадзявацца
па памяці шукаць сваё юнацтва.

Мой Менск — Атава... Што яшчэ дадаць?
Два гарады, падзеленыя даллю...
Я веру, што змагу іх аб'яднаць,
запамятаўшы смутак развітання...
Мая надзея застаецца марай,
нібы жэтон метро, мной прыхаваны.

З прыемнасцю гуляю дзіўным летам
уздоўж ракі... Не задаю пытанняў...
Я горада пачую голас ветлы,
а гладзь ракі — жыцця адлюстраванне...
Там, на вадзе, я родны Менск убачу,
і зноў знайду, а можа, штосьці страчу...

* * *

Складаю словы...
Не так і мала...
Парыў свабоды
раблю сусветным...
Менск і Атаву
яднаю стала:
арол і рэверс
адной манеты...

Мы свету дзеці,
жывога варты...
Святло шукаем,
аб лепшым марым...
Сумненні сёння,
надзеі заўтра —
чырвоны з белым
мой колер сцяга...

Атава, Нёман —
замілаванне...
Сатру на мапах
умоўнасць межаў
і аб'яднаю —
няма пытанняў —
дубы Кіларні
і Белавежы...



## Навальніца

Набліжэнне дажджу...
Мы ў Атаве... Ты верыш?
Асалоду жыцця
неспакоем не змераеш...
Паглядзі...
Як імглістае неба схіляецца нізка...
Хутка горад зальe
навальніца і ў Мінску...

Неба колер сівы...
Шлях пакутны, няпросты...
Нашы тэксты жыцця —
нечаканыя госці...
Быццам лекі, святло
неабсяжнасцю вольнай
супакоіць душу
навальніцай раптоўнай...

Лёгка лодкі плывуць
па лагоднай Атаве...
Не задасць хараство
больш складаных пытанняў...
Цішыня настае...
Бачыш неба так блізка...
Хутка горад зальe
навальніца і ў Мінску...

## Шагал

*Зіне Гімпелевіч*

Нашае жыццё
не наступіць двойчы...
Не стане даўнім,
не пойдзе прама..
А мы, мажліва, паляцім
аднойчы,
як на карцінах
Марка Шагала...

Пазбегнем журботы
свайго маўчання...
Віцебск — Лёзна,
дамы, нібы хмары...
Беларусь —
тэма для навучання
па карцінах
Марка Шагала...

Зялёны скрыпач...
Жыццё без адчаю...
Блакітны дом...
А сонца так мала...
Кропелькі фарбы —
мовы гучанне
ў радках вершаў
Мойшы Шагала.



## Малевіч

Трапецыі любві,
трохкутнік адзіноты,
сусвет — чароўны шар,
дзе не патрэбны ноты.
Шукаю мову фарб,
каб выказаць дакладна,
супрэматызм жыцця
неспалучальных фактаў.
Квадрат квадрату — бог...
Малюю на ўдачу...
На чыстым палатне
даверлівасць убачу,
дзе куб у кубе — стогн
ці адпаведнасць мэты,
дзе глыбіня — закон,
а хараство — ракета...
Імгненнае жыццё
без ціску дуалізму
настроіць пачуццё
на мой настрой празрысты,
дзе стане чорны лёс
нястомнаю галерай...
Малюю свой квадрат
упэўнена і смела.

## Шарль Бадлер

Калі мне патрэбна падтрымка сусвету,
тугу адхіліць, — я чытаю Бадлера...
Ў пустым пераходзе нягучнае рэха
мне чуецца смехам парыжскай хімеры...
Няроўна і хутка праносіцца вечар,
чытаю Бадлера з пласціны экрана,
хоць час справаздачнай жаданай сустрэчы
прыносіць мне болей няпростых пытанняў...

Я мушу чаканага болей пабачыць...
Бязмежжа вясны нараджаецца ў снезе...
Няроўныя вуліцы робяцца небам,
аўто прыпыняюцца, далей не едуць....
Французскаму стылю стараюся верыць...
Парыж вершавання настрой узмацняе...
Ў сыходзячы вечар чытаю Бадлера,
і хваля тужлівая лёгка знікае...



* * *

Мэта музыкі — цішыня...
Тая, што прымушае струны
не чакаць, а шукаць штодня
супадзенне з ужо мінулым.

Мэта музыкі — цішыня...
Акіянам святла яднае
з богам, небам, пачаткам дня,
потым сцішана прападае.

Мэта музыкі — цішыня...
Таямніца, прамень удачы,
суцяшэнне і глыбіня
у жаданні шукаць і бачыць.

* * *

*Г. Туміловіч*

Шоўк восені... Варожасць халадоў
не адчуваем, хоць пазней сустрэнем...
На Шэбрук доўга цешымся цяплом,
нас восень асалодай вабнай грэе...

Нам доўга пешшу хочацца блукаць
па манрэальскіх вуліцах з надзеяй,
каб горад акварэльны адшукаць —
там хтосьці нам свае адчыніць дзверы.

А не адчыняць... Нам далей ісці...
У трапятанні... Больш не абярнуцца...
А потым, быццам золата, знайсці
сваё жаданне зноў сюды вярнуцца.



## Горад

*П. Ш.*

Я намалюю дзіўны горад...
Ён стане жыць сваім жыццём...
Там вуліц доўгіх калідоры
усеахопным прагным днём
святлом таемным задаволяць,
пульсуючым жыццём напоўняць...

Агмень запаліць дзіўны горад...
Сваю душу яму даверу,
пазней пачую горды голас
мінорных і нягучных спеваў...
Я вокны буду маляваць
і плошчаў мары ратаваць...

Я фарбай спелай урачыстай
падкрэслю вуліц прыгажосць,
дзе кожны дом — сусвет празрысты,
дзе брук пад праліўным дажджом —
святла бяздоннага палітра,
а цішыня — мая малітва...

Няспыннай чуласцю і згодай,
таемнай мудрасцю святла,
мой горад прагай да свабоды
запоўніць пустку палатна...
А вуліц дасканалы строй
сваёй узрушыць вышынёй...

## Чытаючы Хагакурэ

Жыць і не рабіць памылак немагчыма.
*Ямамота Цунэтома*

1

«Жыві так,
быццам цябе няма.
Будзе знуранасць,
будзе зіма...
На лязе
чыстага і халоднага
знойдзеш
прамень высакароднага...

Паэзія — гэта інструмент
разумення святла,
яна, як смерць,
не даецца дарма...
Але спяваючы і расцякаючыся,
нібы дым,
напішы Хагакурэ,
як працяг тваіх крыл...»
Такі запіс я знайшоў
у кодэксе самурая...
Хто жыве гармоніяй,
той ужо не знікае...



2

Жадаў бы прыпыніць жыццё,
пазбегнуць адчування смерці,
спазнаць свой лёс, як адкрыццё,
мінулага самоту сцерці.

Жадаў бы словы зберагчы,
памылкі, вершы, спадзяванні,
каб не згубіцца на мяжы
паміж жывым і непрымальным.

Каб у рэальнасці сваёй
у лёгкае сівое ранне
знайсці гарэзлівы настрой
свайму зямному існаванню.

* * *

Без ліхтара і без дарогі
шукаю Бога...



## Слова

Я ведаю, што мы з табой не знікнем...
Агнём зацятым непазбежна станем,
зямлёй сырою, ці вадою ціхай,
ці глыбінёй, — ды толькі не маўчаннем...
Час праляціць, а свет не стане горшым,
запомніць нас на менскіх скрыжаваннях.
Там новы дзень сваё стварэнне знойдзе
і нас натхніць на новае дыханне...
А мы з табою будзем жыць заўсёды:
ці ў шолахах пяску, ці ў хвалях мора,
ці ў небе гордым, у агні вясёлым...
Пакуль ёсць Слова...

## Марская песня

Маёй радзіме не хапае мора,
таму я з'ехаў — мора адшукаць,
каб слухаць суцяшальны гук прыбою,
ў шуканнях марыць, часу не губляць,
халоднаму разліку больш не верыць,
знаходзіць тых, хто мне адчыніць дзверы...

Мяне маёй радзіме не хапае...
Навошта з'ехаў? Што было «не так»?
Праверыць, як надзея не знікае,
шукаючы запалены маяк...
Сваім жыццём жыццё пераканаць,
што навучуся верыць і чакаць...



## Час

1

Час, быццам бог... Упэўненасці шмат...
Усё жыццё сілкуе нашы сэрцы,
не раздражняе, не дае парад,
мы ведаем яго з часоў маленства...
Час падаецца простым і жывым:
глядзіць на нас свабоднымі вачамі,
а мы, акцёры дзіўных пантамім,
іграем п'есу, дзе штодня звычайна:
не выбіраем лёс і свой настрой,
камп'ютарныя шлём паведамленні...
Час робіцца нязвыклай цішынёй,
ён растварае даўнія сумненні...
Час — гэта вечны свету рухавік...
Ён уздымае і дае натхненне,
каб сэнс жыцця пакутліва не знік,
каб адчуваць свой век, нібы імгненне.

2

Час пралятае скрозь календары,
нам дазваляе суцяшацца небам
і адчуваць магчымасць той пары,
калі вяртацца да сябе нам трэба...
Наш час зямны, нібыта крыл узмах,
дзе вышыня — наканаваны шлях...

Секунда, дзень, стагоддзе... Не лічы...
Мы час шануем і не выбіраем...

Час з глыбіні натхнёнасцю гучыць...
Яго знаходзім і яго губляем...
А думаем — не знікне назаўжды,
а зробіцца празрыстасцю вады...

Наш час зямны ніколі не спыніць,
ён — вольны рух бязмежнага эфіра,
шукае, мроіць і дае нам жыць,
і робіць немагчымае магчымым,
каб мы пабачылі святога неба звод,
адчулі лёсу непаўторны ход.

3

Мы душы песцім, нібы кветкі...
Містэрыя не патрабуе сведкаў...
Свой шлях шукаем да сябе вяртацца,
жыць — не спыняцца...

Імкнёмся як хутчэй да небасхілу
і адчуваем прыгажосці сілу,
што нам дае на вышыню прыўзняцца
і там здзіўляцца...

Мы рады пастаянству дзён узнёслых...
Вось за акном маўчаць старыя сосны,
нам час сплятае светласці вянок,
каб бачыў бог...



## Капялюш

Мастацтва бурная рака
        цячэ ў вышынях зорнай далі,
натхнення тонкая вярба
        глядзіць на рэчку ў спадзяванні...
А я на беразе пустым
        абсягі новыя шукаю,
з цікавасцю на свет гляджу,
        вясны квітненнем уздыхаю...
Шукаю вольнасць светлых душ
        і ад здзіўлення заміраю...
Перад мастацтвам я здымаю
        свой папяровы капялюш.

## Людвіг Вітгейштэйн

Свет — гэта ўсё тое, што мае месца.
*Людвіг Вітгейштэйн*

Ён ноч маляваў на пяску Вавілона,
бяздонныя, чыстыя зоркі збіраў
у кошык прыкметаў, прыгожаю мовай
пісаў пра пару непакошаных траў...

Мастацтва спрыяе паверыць у цуды,
сутонню ілюзій, плённасці глебы,
дае заставацца свабодным і мудрым,
нібыта пясок ці імглістае неба...

А потым вяртацца да сэрца радзімы,
па доўгіх маршрутах, заблытаных сцежках
і думаць: жыццё — гэта лёгкае дзіва,
што спрытна ламае і сцены, і вежы...

Праз Браму Іштар ён прайшоў... Не згубіўся...
Хоць ў горадзе вечным губляліся цені,
а свет паўставаў непаўторным і мірным,
і доўга святло не рабілася цемрай...

А потым у раніцу Слова паўстала,
стварыўшы Свет Новы, Любоў і Надзею,
а думкі старыя так лёгка знікалі,
і лёс падаваўся шчаслівым і смелым...



## Свет

Любіце свет, нібыта ён — дзіцё...
Тваё дзіцё... Чакае дапамогі,
падтрымкі, веры, лёгкасці дарогі,
шануе неба, каб трымаць жыццё...

Любіце свет, нібыта ён — дзіцё...
Тваёй любові прагне непадробнай,
аднойчы дорыць пачуццё свабоды
і давярае абуджаць святло...

## Вышыня

У цішыні ёсць некалькі цішынь.
*С. Панізнік*

У вышыні ёсць некалькі вышынь...
Дайсці да іх мне падаецца мэтай:
малітвай, спевам, сілаю душы,
шляхамі захаплення і імпэту...
Адчуць вышынь недасягальны лёд
і птушкай праляцець над прорвай горнай,
не думаць пра свой будучы сыход
і заставацца ў вышыні свабодным...



* * *

Халодны дзень, як у зіму,
дашле нам новае натхненне,
цябе пяшчотна абдыму,
тваё пабачыўшы здзіўленне...
І ў гэты хмарны сціплы дзень
адчуем, быццам непазбежнасць,
тваёй упэўненасці хмель,
маёй жаданасці бязмежжа...

* * *

*М. Р.*

Дай мне напіцца цягніковай вады...
*Б. Г.*

Мне б яшчэ напіцца
вады цягніковай:
халоднай, празрыстай
і незразумелай,
той самай, з песні
Барыса Грэбеншчыкова,
які спяваў так натхнёна,
заўсёды смела...
А потым шукаць спадзяванне
у словах,
што расцякуцца па вершах,
нібы па венах,
дадуць зразумець, што праўда
на розных мовах
стане прыдуманым і
чыстым спевам.

Мне б яшчэ напіцца
вады цягніковай,
свядома і лёгка
нарабіць памылак.
Не думаць пра тое,
што заўтра знойдзем
магічнасць думкі,
што ёсць прыпынак...
А восенню ў вырай
ляцець імкліва,
не пытацца нават,
куды вырай рушыць,
каб на вяршынях праверыць
адметнасць сілы,
што нас спяваць і верыць
жыццю прымусіць.

## Жыццё

Рэчка не робіць памылак...
Дрэвы не хлусяць нікому...
Праўда ніколі не стане
тэарэмай ці аксіёмай...
Дзёрзкасць не мае сумневу,
вечар хавае святло,
вецер — быць чутным і смелым —
б'е у пад'ездах шкло...
Ды толькі я... На пылкіх дарогах
не зведаў, што ёсць жыццё...
А яно — непрадказальнасць,
напружанасць і незвычайнасць,
стварае і спадзяецца,
знікае і застаецца...

# «Твой голас мілы я яшчэ пачую...»

## Ліст

Даўно я не пісаў табе лісты.
Нашто пісаць, калі заўсёды побач
твой тонкі твар і валасы,
што гладжу я у час даўно за поўнач.
Нам трэба бачыць глыбіню ў сабе —
там нашы душы назаўжды спляліся,
паверылі таемнай варажбе
і ўзнесліся ў хвалюючыя высі.

Шалёны лёс не забываў пра нас,
даваў адчуць парывістасць свабоды
і для кахання смела дараваў
суквецце вабнай дзіўнай асалоды...
Мы разам... Ты заўсёды побач...
Лёс не спыніць і не зрабіць прасцей.
Я напісаў шчаслівы ліст — напомніць,
як доўга нам яшчэ ісці далей.

* * *

Пажары восені тваёй
таемнай і нястомнай сілай
у лёгкім непаўторным стылі
стваралі велічны настрой,
з якім я лёгка маляваў
суквецце восеньскіх рэалій,
збіраў, як здымкі інстаграм,
душы сваёй перажыванні...

Пажары восені тваёй
прываблівалі яркай сілай,
і языкі агністых ліній
сплаўлялі залата з душой...
І час ішоў... І час ляцеў...
З імпэтам сталасці саспелай
лёс нам дарыў з нязменнай верай
усё, што меў...



## Фота

На вуліцах бачу ліхтаровыя цені
хутка шпацыруючых мінакоў...
Вечаровы дождж абмывае сцены,
машыны, вокны, балкон...
Гадзіннік памяркоўна цікае,
нагадваючы —
час нікуды не знікае...
Ды толькі я...
Шукаючы выйсце з ракі непазбежнасці,
павесіў фота тваё ля свайго акна...
Яно непасрэднае, смелае, вечнае,
чыстая элегія ці энергія
твайго і майго святла, —
тваёй усмешкі адкрытасць звычайная,
прамень надзеі выратавальны...

* * *

Твой голас мілы я яшчэ пачую,
твой любы твар убачу праз гады.
Мы ўвечары ля рэчкі заначуем,
і ты даруеш мне усе грахі,
якіх не шмат, бо верыў і стараўся
пазбегнуць здрады, горычы атрутнай.
«Даруй» казаў, шукаў і спадзяваўся
пачуць твой голас пранікнёна-чуйны...



* * *

Ў маіх вершах ты шукаеш
дзіўнай музыкі вытокі,
лёгкі снег, што будзе першым
у наступную суботу...
Ў хаце цёпла і прыемна,
кніжак новых напампуем,
і ў чытанні, як заўсёды,
свята слаўнае адчуем...

Больш нам трэба чыстых фарбаў,
каб пісаць жыцця сюжэты,
болей трэба дум сапраўдных,
старадаўніх рарытэтаў...
Хай нічога не турбуе,
калі нават знікнуць сцены...
Дабрыню святла адчуем,
радасць зробіцца ўзаемнай...

Ў маіх вершах ты шукаеш
шчырую сваю ўсмешку,
мілагучнасць дзіўных песень,
што знаходзяць тую сцежку,
і вядзе мяне заўсёды
на ўскраек небасхілу,
да надзеі, да свабоды,
да натхнёнасці імклівай.

Ты пачуеш мае думкі
у маіх нягучных вершах,

і далей не будзе суму,
стане вечар лёгкай песняй...
Не хвалюе стан надвор'я,
бо каханасць нашых сэрцаў
і паэзіі агністасць
застануцца асалодай —
неабсяжнай і ўрачыстай...

Першы снег ляціць у вокны,
разлятаюцца хвіліны...
Ў маіх вершах ты шукаеш
дзіўнай музыкі парывы...



## На рэчцы ўвечары

На рэчцы... І сонца заходзіць...
Вось цені працяглымі сталі...
Нам хочацца страціць умоўнасць
і лашчыць бясконцыя хвалі...

— Ідзі, не спыняйся і плавай...
Глядзі, як чаруе сутонне,
як быццам парывы кахання,
цяпло аддае наваколле...

— Глянь, чайка прысела на бераг...
Вось лінію лодка дакладна
на тонкай малюе паверхні,
і робіцца вечар манадай...

Ласкавае сонца заходзіць...
Вада паглынае сумненні...
А мы толькі рады нагодзе
сваё адчуваць прыцяжэнне...

## Summertime

Гэты час не растане ніколі...
Вечар горда і велічна стыне,
пейзаж назіраем павольна...
На вадзе мы, нібы на карціне,
рабізны разглядаем дэталі,
і знікаюць стракатыя далі...

Будзем доўга разважліва плаваць,
сілай рухаў натхняць наваколле,
і асмужанасць цел, быццам сталасць,
нараджаць стане новыя словы...
Мы плывём у нязбытныя мары,
рэхам чуемся далей і далей...

Летні час ціхай лодкай сплывае...
Верым — сэрцаў не спыніцца рух.
Эла песню спагадна спявае,
чуем роўны настойлівы гук:
«Summertime, and the livin' is easy», —
абдае суцяшаючым брызам.



## Ліпеньскі снег

Антарыа... Возера... Поўня...
        З пятніцы на суботу.
«Кэнан» хапае святло,
мяк рыба, адкрытым ротам.

Ззянне месяца асядае на ёлках,
        стварае адчуванне зімы,
малюнак упэўнены, роўны...
        А мы застаёмся адны.

Сваім вачам не паверым...
        Ці можа быць столькі снегу?
Лес нам бачыцца белым,
        дном калодзежа — неба.

Ноч... Аціхлыя дрэвы
        слухаюць нашы размовы,
а дотыкі нашых далоняў
        чытаюцца намі, як словы.

Каб зразумець сутнасць шчасця,
        мы марым сюды вяртацца,
прагна шукаць натхнення,
        верыць і спадзявацца.

А ноч сваім прыцяжэннем
        натхніць пражыць доўгі век,
хоць фота не захавалі
        той дзіўны ліпеньскі снег.

## Узор

Шоўк холаду кладзецца на зямлю,
сапраўднасці сваёй знаходзіць месца.
Якую ж я старонку адгарну,
каб запісаць святло зімовых тэрцый?
Ідзе зіма... Дапоўніла прастор
прыгожаю выявай Боны Сфорцы —
так на акне мароз стварыў узор,
каб прывітаць упэўненае сонца.



* * *

Пра спадзяванні больш не мару...
Твой позірк мяккі вывучаю
і ведаю — даўно не маю
ні адзіноты, ні адчаю...
А нам ніхто не перашкодзіць
адчуць задавальненне ночы.

Мы свой гартаем каляндар...
Мінулага знікаюць даты...
Бясконцым бачыцца абшар,
дзе мы жывём, жывём узнята...
Дні ж лёгка музыку іграюць
і аб працягу доўгім мараць...

## Агонь

> Толькі попел ведае, што значыць згарэць
> дашчэнту...
> *І. Бродскі*

Мэта жыцця —
        адшукаць патаемны агонь...
Прыйдзецца доўга шукаць,
        але гэта магчыма...
Потым... Адно...
        Трэба пакласці агонь на далонь...
Доўга трымаць... Адчуць,
        як памяць яго не стыне.

Агонь надасць пачуццё асалоды...
        А боль?
Пройдзе раптоўна...
        Няхай не адразу...
Заўсёды пытаюся:
        «Смелы агонь, ты мяне супакой».
Ён жа няроўна гарыць
        і мне не дае адказу...

Агонь ніколі не паўтараецца...
        Нібыта жыццё...
Бо ў поўнай бязмежнасці
        свайго існавання
памятае пра тое, што ён
        ратуе святло
любасці, веры і сілы
        тваіх і маіх спадзяванняў.



## Камень

Апошнім часам стала зразумела:
лёс даў табе душу — мне цела...
Пражытаму мы не падводзім вынік,
шукаем шчасце і знаходзім плыню,
што чыстаю надзеяй лёгка стане
і прыме ўсе сумненні з разуменнем,
пацвердзіць — мы ж глыбіні захавалі,
дзе любасці для нас не будзе меней.

Вось час вядзе праз княства ціхай ночы,
дзе мы адны па сутарэннях крочым
і там знаходзім свой спагадны космас —
той, што ў любоў ператварае роспач...
Твой позірк дзіўны... Хай без спадзявання...
Законы пераймання не прымаем,
бо паслядоўна для сябе ствараем,
ты — чыстую душу, я — камень.

## Дарога

Два дні таму мне снілася дарога...
І даўні горад, быццам дапамогу,
вяртаў пяшчоту нашым адчуванням,
а лёгкі шар старых перажыванняў
нас нёс у доўгі вузкі калідор,
дзе ў даўнюю пару стаяў дзяцінства дом...
У доме тым я жыў даволі мала...
Каштаны ў траўні расквіталі рана,
мы ўвечары глядзелі праз акно,
як там жыццё руплівае плыло.

Зноў сонца падымалася звычайна,
шум гораду губляў сваю нуду,
а раніца — майстэрня спадзяванняў,
усход пераплаўляла, як руду,
ў нязменны лёс...
У горадзе хацелася застацца,
ды час ішоў, не дазваляў спыняцца
ні нам, ні тым, каго вяла дарога, —
нязвыкла доўга...



## Крок

Мы любім дзень... Мы любім ноч...
Той час, калі праходзіць дождж...
Калі шукаем без пары
дзяцінства даўняга двары...

Нам вельмі лёгка адказаць...
Хоць немагчыма даказаць,
як захаваць душы спакой,
жыццё напоўніць глыбінёй.

Над намі лёталі шпакі,
лавілі рыбу рыбакі...
Каля Бярэзіны ракі
мы пачалі сваю дарогу...

Па ёй пайшлі... Святло гірлянд...
І горад, як на маскарад,
дарыў любові непаўторнасць
і светлую ствараў чароўнасць...

«Мы доўга, доўга пражывём
і пабудуем светлы дом!» —
казаў табе са спадзяваннем...
Жыццё лічыў выпрабаваннем...

Бо доўга нам яшчэ ісці...
Нам трэба да сябе дайсці...
Таму выходзім за парог
і робім свой наступны крок...

## Дом

Дом...
Час праляціць арлом...
Дом цяпло захавае.
Часам у ім спяваем.
Ён разаб'е варожасць,
зробіць дакор няможным...
Вокны глядзяць на дрэвы...
Горад... Жыццё... Надзея...

Дом...
Кліча жывым агнём,
ціхім паветрам, богам.
Зноў павядзе дарога...
На скрыжаваннях лёсу
будуць бліжэй нябёсы...
Дом назаўсёды стане
месцам твайго вяртання...

Дом...
Чую далёкі гром...
Рэха майго дзяцінства...
Лета... А мне не спіцца...
Мама прачнецца рана...
Раніца ўжо паўстала...
Дом ажыве, і зноў
я пазаву сяброў...



## Твой дзень

Твой дзень падобны на жыццё:
парой няпросты, але дзіўны...
Твой дзень — вялікае акно...
Гляджу ў яго: там горад мірны,
жыццёвасці гарыць агмень,
знікаюць чорныя сумненні...
Атавай паўстае штодзень
шаўковая трава натхнення...

«Твой дзень падобны на любоў,
блуканне на вышынях раю», —
так напісаў Сюлі-Прудом...
Паслухай — музыка іграе,
нібы шукае глыбіню,
каб падтрымаць закон бяздоння,
а я гляджу на вышыню —
твая душа — вянок сузор'яў...

Твой дзень падобны на жыццё:
святочны, лёгкі, прывітальны...
І марыцца зрабіць адно:
у горад той паехаць даўні,
дзе светлага агністы ток
пальецца плыняй захаплення,
там першы дзень, як першы крок,
узыдзе зоркай Нараджэння...

* * *

«Любіць жанчыну трэба больш натхнення,
чым верш прыгожы напісаць», —
пісаў Вергілій,
можа, у час сумнення,
ці каб пачуццяў смелых не хаваць...
Настойліва шукаў кахання прыцягненне,
каб зразумець, а потым даказаць:
кахаць жанчыну — дзёрзкасць і натхненне,
не ведаць як,
але заўжды кахаць...



## Усход

*В. Т.*

Зоркі знікаюць...
Лёгка — адна за адной...
Сонца вяртае
лету чароўны спакой...
Свеціцца ранак,
каб безнадзейнасць зламаць...
Памяць даецца —
даўнія дні ратаваць...

Раніца ветла,
быццам бы ўзмахам крыла,
самаахвярна
дасць дастаткова святла...
Лёгка падорыць
веданне страчаных моў,
міг адчування —
ўсё пачынаецца зноў...

* * *

Застаёмся у горадзе...
Доўгі «ўікенд»...
Суседзі з'ехалі...
Нам не да іх...
Жаданне быць разам —
прываблівы свет...
Падзелім свой горад,
як хлеб, на дваіх...

Мы чуем раскутыя
спевы цыкад,
так горад спявае
без ведання гам,
увечары вокны —
як бісер гірлянд,
яшчэ чакаюць
сваіх інстаграм.

Маўчанне — нагода
знайсці свой гук,
дзе спальны раён —
прыгрэбнік святла —
нам дасць пабачыць,
як вечар патух,
хаваючы роспач
свайго забыцця...



## Па-за часам

*Юрасю Логвіну*

Восень цешыць цішынёю...
Мы адны...
Халады няспынна крочаць
да зімы.
У распаленым каміне
газ гарыць.
— Што далей? — Не трэба думаць.
Проста жыць.

Паважаць сухія лічбы
новых дзён,
адшукаць даўно прыбраны
парасон.
І забыць свайго маўчання
множны лік,
адчуваць з жыццём спатканне,
быццам міг.

Кропкай бачымся адзінай
мы здалёк,
нам на беразе бязлюдным
сніцца бог,
і магчымы ўсё хвалюе
разварот —
дзе ён будзе, край наш мілы,
праз сто год.

Жоўтым мёдам наваколле
          ахмяліць.
Грэе нас агонь камінны,
          час гарыць.
І вядуць, вядуць нас доўга
          праз агонь
пушчы восені бяздоннай,
          залатой.



* * *

Што там, на тым баку святла?
Упэўненасць і ратаванне,
дзён будучых выпрабаванні?
Вось там, на тым баку святла,
на нас глядзіць праз акіян
высакароднасць, міг удачы?
Невідавочнае пабачыць —
заўжды непрадказальны дар.

Што там, на тым баку святла?
Сапраўднай музыкі вытокі,
усё, аб чым маўчаць прарокі?
Вось там, на тым баку святла...
Параз і перамог выток?
Мажліва, там пануе ціша,
што з лёгкасцю нязменнай піша
табой напісаны радок?

# Змест

### Уступ

Непрадказальнае ........ 5
* * * «Пішы, як іншыя не пішуць...» ........ 6
Мая прастора ........ 7

### «У Менску я не заблукаю...»

* * * У Менску я не заблукаю... ........ 11
* * * Мой горад, зноў цябе я бачу... ........ 12
* * * Шуканне бога — безнадзейна ў Менску... ........ 13
* * * Зноў у Менску вясна!.. ........ 14
Захад восені... ........ 15
Снег у горадзе ........ 17
Ускраіна Поля Дельво ........ 18
Чытаючы кнігу Адкрыцця ........ 20
Раніцай ........ 21
Швэдар ........ 22
* * * Мае вытокі — менскія Шары... ........ 23
Вечаровае ........ 24
* * * Я дзякую Богу за міласць... ........ 25
Падарожжа ........ 26

### Куды б я ні ехаў, заўсёды прыеду дадому, або Перэгрынацыя ў сучаснасці

Успамін пра Радзіму ........ 29
Правідэнсьялес ........ 30
Колеры ........ 33



Венецыя ........ 35
У залі Бацічэлі галерэі Уфіцы ........ 37
Вакзал ........ 38
Начны ад'езд ........ 39
Еўропа ........ 40
Герані ........ 41
* * * Убачыш Паўночнае мора... ........ 42
Тафіна ........ 43
* * * Шматкроп'е нязменных прыцішаных гор... ........ 45
Шпацыр па беразе Ціхага акіяна ........ 46
Меланхалічны захад у Ванкуверы ........ 48
Хмарачос ........ 50
Беларуская Атлантыка ў бухце Пегі ........ 51
Алма ........ 53
Слухаючы Філіпа Гласа ........ 55
Снежань ........ 56
Перамога ........ 58
* * * Нечакана захочацца з'ехаць... ........ 60

### Мой Менск — Атава...

Адлюстраванне ........ 63
* * * Складаю словы... ........ 64
Навальніца ........ 65
Шагал ........ 66
Малевіч ........ 67
Шарль Бадлер ........ 68
* * * Мэта музыкі — цішыня... ........ 69
* * * Шоўк восені... Варожасць халадоў... ........ 70
Горад ........ 71
Чытаючы Хагакурэ ........ 72
* * * Без ліхтара і без дарогі... ........ 74
Слова ........ 75
Марская песня ........ 76
Час ........ 77

Капялюш ........................................................................ 79
Людвіг Віттгейштэйн ................................................ 80
Свет ............................................................................. 81
Вышыня ...................................................................... 82
* * * Халодны дзень, як у зіму... ........................... 83
* * * Мне б яшчэ напіцца... ...................................... 84
Жыццё ......................................................................... 86

## «Твой голас мілы я яшчэ пачую...»

Ліст ............................................................................. 89
* * * Пажары восені тваёй... ................................... 90
Фота ............................................................................ 91
* * * Твой голас мілы я яшчэ пачую... ................. 92
* * * Ў маіх вершах ты шукаеш... ......................... 93
На рэчцы ўвечары .................................................. 95
Summertime ............................................................... 96
Ліпеньскі снег ........................................................ 97
Узор ............................................................................ 98
* * * Пра спадзяванні больш не мару... ............. 99
Агонь ........................................................................ 100
Камень ..................................................................... 101
Дарога ...................................................................... 102
Крок .......................................................................... 103
Дом ............................................................................ 104
Твой дзень ............................................................... 105
* * * .......................................................................... 106
Усход ........................................................................ 107
* * * «Любіць жанчыну трэба больш
натхнення...» ......................................................... 108
Па-за часам ............................................................. 109
* * * Што там, на тым баку святла?.. ................... 111

**Шамецька, Ю.**

Ш19 Непрадказальнае : вершы / Юрась Шамецька. — Мінск : Кнігазбор, 2019. — 116 с.
ISBN 978-985-7207-76-3.

Юрась Шамецька нарадзіўся ў Мінску, а з 1997 года жыве і працуе ў Канадзе. Аматары паэзіі ведаюць яго вершы па зборніках «Шлях да вяртання» і «Атава», па публікацыях у часопісах «Дзеяслоў», «Маладосць», альманаху «Беларус», газеце «Літаратура і мастацтва». Жыццё як падарожжа — тэма новай кнігі паэзіі Юрася Шамецькі «Непрадказальнае». Лірычныя вершы аўтара дазваляюць лепей адчуць глыбіню і непрадказальнасць вечнага, пераканацца ў чыстых і вабных імкненнях любові, паверыць у выратавальнасць і шматграннасць хараства.

**УДК 821.161.3**
**ББК 84 (4Беи)**

Пры афармленні вокладкі выкарыстана фота туманнасці IC1396 канадскага астрафатографа Алега Буевіча.

12+

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**Шамецька** Юрась Дзмітрыевіч

НЕПРАДКАЗАЛЬНАЕ

*Вершы*

Адказны за выпуск *Г. Вінярскі*
Рэдактар *В. Трэнас*
Вёрстка *Л. Гарадзецкай*
Карэктар *В. Трэнас*

Падпісана да друку 16.04.2019. Фармат 80×100 1/32.
Папера афсетная. Друк лічбавы.
Ум. друк. арк. 5,37. Ул.-выд. арк. 2,7.
Тыраж 300 экз. Зак. 146.

ПУП «Кнігазбор».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка друкаваных выданняў № 1/377 ад 27.06.2014.
Вул. Я. Лучыны, 38-93, 220112, Мінск.
**Тэл./факс (017) 207-62-33, тэл. (029) 772-19-14, 682-83-86.**
E-mail: bkniha@tut.by

Надрукавана з арыгінала-макета заказчыка ў ЗАТ «Аргбуд».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка друкаваных выданняў № 2/182 ад 15.02.2016.
Вул. Берасцянская, 16, 220034, Мінск.